# ДА ПЫТАННЯ АБ НЯМЕЦКІХ ВАЙСКОВЫХ ПАХАВАННЯХ ЧАСОЎ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

А.А. Башкоў, А.А. Савіч
*г. Брэст, БрДУ ім. А.С. Пушкіна*

Сёння, на жаль, прыходзіцца канстатаваць, што грунтоўных прац па гісторыі Першай сусветнай вайны на Беларусі не багата. Падзеі на Беларусі не абыйшлі ў сваіх працах шэраг савецкіх гісторыкаў: Вержхоўскі Д.В., Ляхаў В.Ф. (1), Растуноў І.І. (2) і інш. Толькі апошнім часам пытанні, звязаныя з Першай сусветнай вайной на Беларусі, разглядаюцца ў працах беларускіх даследчыкаў. Але ў асноўным разглядаецца аспект узаемадачыненняў нямецкіх акупацыйных улад з мясцовым насельніцтвам. І ў большасці сваёй уціск робіцца на іх эканамічны бок. Так, напрыклад, вядомыя ў гэтым сэнсе працы Мігуна Д.(3) і Платонава Р. (4). Праўда, гісторыкі не абыйшлі і пытанні, звязаныя з непасрэдна баявымі дзеяннямі на тэрыторыі Беларусі. Так, напрыклад, Карнялюк В. (5) паказаў адзін з яскравых эпізодаў Першай сусветнай вайны ў Гародні. Дарэчы, у працы гэтага аўтара узнята пытанне аб неабходнасці захавання нямецкіх пахаванняў на Гарадзеншчыне.

На Берасцейшчыну Першая сусветная вайна прыйшла ў верасні 1915 г., калі пад пагрозай акружэння расейскія войскі пакінулі Вільна, Гродна, Ліду, Брэст, Пінск і іншыя заходнія гарады. Стаўка Галоўнакамандуючага расейскімі войскамі была перавезена з Баранавіч у Магілёў, а фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск – Паставы – Баранавічы – Пінск. Што тычыцца г. Брэста, то вядома, што пасля захопу горада немцы на тэрыторыі крэпасці размясцілі штаб Усходняга фронта. Адразу неабходна адзначыць тое, што горад разам з крэпасцю быў заняты германскімі войскамі без баёў. Рускія палічылі за лепшае здаць горад і крэпасць, бо ў жніўні 1915 г. немцы ў выніку манеўра абышлі Брэст і стварылі пагрозу акружэння для вайсковых злучэнняў, якія знаходзіліся ў горадзе і на тэрыторыі крэпасці. На працягу больш трох гадоў нямецкія вайсковыя ўлады былі гаспадарамі ў Брэсце. Тут, як агульнавядома, 3 сакавіка 1918 г. быў падпісаны Брэсцкі мірны дагавор паміж Германіяй і Савецкай Расіяй. Тое, што Берасцейшчына заставалася пад уладай немцаў, тлумачыць з'яўленне шэрагу нямецкіх пахаванняў, напрыклад каля вёсак Тэўлі, Дамачава, Палтаранавічы і інш.

Вядома, што яшчэ ў лістападзе 1918 г. пасля заканчэння вайны была адноўлена Польская дзяржава. Паступова нямецкія войскі пачалі адыходзіць на захад, у сваю чаргу польскія вайсковыя злучэнні пачалі займаць адпаведныя тэрыторыі, на якіх усталёўвалася іх ўлада.

Аднак гэтыя працэсы не праходзілі без ваенных сутычак, аб чым сведчаць некаторыя аўтары. Так, напрыклад, Д. Вашчукувна-Камянецкая сцвярджае, што па ўсёй Польшчы пачалося раззбраенне і выгнанне немцаў. 8 лютага пасля 14 гадзін барацьбы польскія атрады з аператыўнай групы генерала А. Лістоўскага ўвайшлі ў Брэст. У горадзе ішлі баі паміж немцамі, якія адыходзілі, і эскадронам Б. Дамброўскага (6). У сувязі з гэтым цікавым бачыцца лёс загінуўшых нямецкіх вайскоўцаў і іх пахаванняў.

Зараз помнікі часоў Першай сусветнай вайны разглядаюцца з пункту гледжання гістарычнага аб'ектывізму. Дзеля справядлівасці неабходна адзначыць, што такі падыход дамінуе ў тыя часы, калі грамадства дасягае пэўнай геапалітычнай стабільнасці. Так, напрыклад, у сярэдзіне 30-х гадоў XX стагоддзя польскія ўлады пайшлі на тое, каб належным чынам упарадкаваць магілкі нямецкіх салдат часоў Першай сусветнай вайны. Прычым форма надмагільных помнікаў была аднолькавай як для польскіх жаўнераў – сваіх, так і для чужынцаў-немцаў. Напэўна, гэтыя дзеянні можна растлумачыць часовым пацяпленнем нямецка-польскіх адносінаў. У гэтым кантэксце варта ўзгадаць вядомае нямецка-польскае пагадненне – пакт аб ненападзе 1934 г. Акрэсленыя мерапрыемствы павінны былі пацвердзіць добрую волю польскага боку ў адносінах да свайго заходняга суседа. Аднак успыхнула Другая сусветная вайна, заходняя частка Польшчы была акупавана гітлераўцамі, усходнюю занялі савецкія войскі. Потым пачалася нямецка-савецкая вайна, якая прынесла вялікія ахвяры, гора і нястачы беларускаму народу, ва ўспамінах якога нямецкія вайскоўцы далёка не заўсёды паўставалі ў ружовых колерах.

У апошнія гады для беларускай грамадскасці адным з хвалюючых пытанняў з'яўляецца праблема сучаснага стану ваенных пахаванняў розных часоў. Да найбольш вострых і прынцыповых неабходна аднесці спрэчкі адносна нямецкіх вайсковых паха-

ванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Відавочна, такая палеміка мае пад сабой сталы маральна-этычны грунт. З аднаго боку, гутарка ідзе пра магілы "акупантаў, забойцаў, фашыстаў-катаў", якія ажыццяўлялі на тэрыторыі Беларусі палітыку генацыду ў адносінах да яе насельніцтва. З другога боку існуе пазіцыя, што загінуўшыя нямецкія салдаты самі сталі ахвярамі, выконваючы загад свайго палітычнага кіраўніцтва.

Хацелася б адзначыць, што паміж нямецкімі вайсковымі пахаваннямі часоў Першай і Другой сусветных войнаў часта выстаўляецца знак тоеснасці. Гэта безумоўна звязана з усталяваўшымся ў нашым грамадстве стэрыятыпам, дзе немец разглядаецца пераважна як акупант. Значную ролю ў фармаванні дадзенага стэрыятыпу адыграла і дзяржаўная ідэалогія ў савецкія часы. Аднак відавочная розніца ў стаўленні нямецкіх акупацыйных улад да мясцовага насельніцтва ў часы дзвюх сусветных войн прымушаюць нас лічыць дадзены падыход не абгрунтаваным.

Аднак, у другой палове XX стагоддзя такі падыход меў месца. Так, напрыклад, у 2000 годзе на месцы знесенага будынка, ў межах гарадской бальніцы паміж вуліцамі Леніна, К. Маркса, Дзяржынскага, Маскоўскай, у двары студэнцкіх інтэрнатаў БрДУ, была зроблена незвычайная знаходка. Стары драўляны будынак гаспадарчага прызначэння быў знесены, а пляц на якім ён стаяў – зневеляваны. Пад невялікім пластом будаўнічага смецця, выпадкова былі ўскрыты бетонныя пліты з магіл нямецкіх жаўнераў часоў Першай сусветнай вайны. Нажаль пэўнай сістэмы размяшчэння гэтых плітаў прасачыць не ўдалося. Але заглыбленне ў зямлю, награмаджэнне іх на месцы зруйнаванага будынка, сляды будаўнічага раствору на іх – усё гэта дае нам падставы сцвярджаць, што яны былі выкарыстаны для ўмацавання падмурку.

Цэлыя і пашкоджаныя пліты, агульнай колькасцю 14 штук, былі вызвалены з пад зямлі і захаваныя ў бяспечным месцы, дзе быў зроблены першасны аналіз. Надмагільныя пліты былі пачышчаны, замераны, зафатаграфаваны і замаляваны. Шэсць з выратаваных плітаў захаваліся амаль поўнасцю з ўсімі эпіграфічнымі надпісамі. Шэсць – захаваліся часткова з адпаведнай стратай эпіграфічнай інфармацыі. Дзве пліты моцна пашкоджаны будаўнічым растворам у сувязі з чым, без адпаведнай рэстаўрацыйнай апрацоўкі, надпісы не магчыма прачытаць.

*Пліты аднатыпныя, адлітыя з бетона. Ніжняя і верхняя грані пліты маюць прамавугольную* форму, бакавыя – трапецыяпадобную. Памеры граняў: ніжняя – 42х40 см, верхняя – 46х40 см, бакавыя – 10х46х20х42 см. Верхняя грань мае форму роўнабаковага крыжа, дзякуючы аднолькавым квадратным заглыбленням па вуглах. На верхнім промні крыжа выбіты невялічкі лацінскі крыж. У цэнтральным полі крыжа на польскай мове выбіты эпіграфічны надпіс, які ўтрымоўвае: прозвішча жаўнера, ініцыялы альбо імя цалкам, род войскаў, нумар вайсковай адзінкі, дату смерці. Зафіксаваныя наступныя прозвішчы: Schubert M. (Farer), Rozental E. (Landsturm), Kremer F. (Muschketeur), Karstensen J. (Muschketeur), Bernhardt K. (Offizir Stellvertreter), Nestmann W. (Husar), Kotaj A., Nille (Verwaltungsgerichtshoj), Swidewky Ch. (Landsturm), Dume A. (Kranken Schwester), Clewer J. (Gefreiter), Hombur(n)g W. (Landsturm). Даты смерці пахаваных вагаюцца ў межах 1915-1918 гг. Дадзеныя вайсковых частак таксама розныя. На левых трапецыяпадобных гранях плітаў выбіты год 1936. Толькі на адной пліце стаіць год 1934. Верагодна гэта гады ўстаноўкі плітаў польскімі ўладамі на месцы старых помнікаў нямецкім жаўнерам. Ніжнія грані плітаў моцна пашкоджаны і дэфармаваны, відаць, у выніку зрывання іх з цэментнай асновы.

Агляд мясцовасці паказаў, што на азначаным месцы, верагодней за ўсё, знаходзіцца яшчэ пэўная колькасць падобных помнікаў. Ускрыццё іх магчыма толькі пры правядзенні паўнавартасных археалагічных раскопак на месцы разбуранага будынка.Пасля вайны геапалітычны баланс змяніўся. Узгаданыя могілкі нямецкіх салдат Першай сусветнай вайны аказаліся на савецкай тэрыторыі. На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што адносіны да іх не адпавядалі вядомаму меркаванню А. Суворава, які лічыў вайну не скончанай да таго часу, пакуль не будзе пахаваны апошні салдат, які загінуў падчас яе. Стаўленне да гэтай праблемы зноў-такі можна суаднесці з ідэалагічнымі ўстаноўкамі. Напрыклад, сёння можна ўбачыць, на польскіх могілках г. Брэста асобную алею магіл польскіх жаўнераў. "Poleglym slawa", – чытаем мы па польску. Што тычыцца нямецкіх пахаванняў, то лёс іх, у некаторых выпадках, на жаль, быў прыкрым. Канешне, названы факт не ёсць з'ява ўнікальная, аб падобнага кшталту выпадках неаднойчы

змяшчаліся матэрыялы ў перыядычным друку. Дадзенае паведамленне сваёй мэтай ставіць пошук кола зацікаўленых асоб і арганізацый для правядзення пэўных мерапрыемстваў, у тым ліку пошукавых. Справа ў тым, што першапачатковыя спробы знайсці месца пахаванняў, а значыць і папярэдняе месца знаходжання пліт, аказаліся марнымі. А зрабіць гэта неабходна, калі мы прэтэндуем на званне цывілізаванага грамадства.

Робячы падсумаванне, зазначым наступнае:

- захаванне помнікаў нямецкім жаўнерам павінна стаць неад'емнай часткай аховы гістарычнай спадчыны нашай Бацькаўшчыны;
- вывучэнне нямецкіх пахаванняў часоў сусветных войнаў павінна заняць адпаведнае месца ў сістэме навуковых даследаванняў;
- далейшае вывучэнне помнікаў, знойдзеных у цэнтры г. Брэста, у прыватнасці ідэнтыфікацыя пахаваных, бачыцца нам магчымым пры далучэнні архіўных матэрыялаў Германіі і Польшчы, а таксама зацікаўленасці ў гэтым адпаведных нямецкіх дзяржаўных і навуковых устаноў.

Літаратура:

1. Вержховский Д.В., Ляхов В.Ф. Первая мировая война 1914-1918 гг. – М., 1964.
2. Ростунов И.И. Русский фронт Первой мировой войны. – М., 1976.
3. Мигун Д. Политика грабежа и насилия // Беларуская думка. – 2001. – № 8. – С. 145-147.
4. Платонаў Р. Пад пятой германскага кайзера // Беларускі гістарычны часопіс. – 2001. № 2, 5.
5. Карнялюк В. Гродзенскі эпізод Першай сусветнай вайны // Беларуска-нямецкае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучаснасць, перспектывы: Матэрыялы міжнароднага "круглага стала" (29-30 красавіка 1996 г.). – Мн., 1996. – С. 34-38.
6. Д. Вашукувна-Каменецка. Брест – город незабываемый. – Брест, 1999. – С. 91.

# КАНЦЭПЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ САВЕЦКІХ ЭМІГРАНТАЎ У ГЕРМАНІІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XX СТ.)

Л.Ю. Малыхіна

*г. Брэст, БДТУ*

Складванне гістарыяграфічнай канцэпцыі беларускай дзяржаўнасці ў Германіі звязана з арганізаваным беларускім рухам пасля ўсталявання на Беларусі савецкай улады. Дзеячы і стваральнікі Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) сталі выдаваць ў замежжы літаратуру па гісторыі свайго народа, дзе заяўлялася пра імкненне беларусаў да пабудовы сваёй дзяржаўнасці. Яны пазнаёмілі еўрапейскія палітычныя і навуковыя колы з тагачасным становішчам Беларусі, апелявалі да сусветнай грамадскасці ў справе яго дзяржаўна-палітычных правоў.

Традыцыі нацыянальнай гістарыяграфіі пасля Другой сусветнай вайны працягвалі навукоўцы, якія апынуліся ў эміграцыі ў якасці сталых даследчыкаў (А.Адамовіч, Я.Станкевіч, В.Жук-Грышкевіч і інш.). Дзяржаўна-палітычныя зрухі на Беларусі пасля Кастрычніка 1917 г. знайшлі сваё адлюстраванне на старонках беларускамоўных выданняў Германіі – "Шляхам жыцця", "Бацькаўшчына" (Мюнхен), "Пагоня" (Зальцбург) і інш.

Першым зародкам арганізацыйнага афармлення творчых навуковых сіл стала Крывіцкае (Беларускае) навуковае таварыства Ф.Скарыны, створанае ў Рэгенсбургу (Германія) у 1947 г. у лагеры для перамешчаных асоб [1]. Гэтае таварыства, ініцыятарам якога быў Янка Станкевіч, наладзіла выпуск навукова-літаратурнай газеты "Веда", якая друкавалася пазней у Брукліне і Нью-Йорку [2]. Творчыя сувязі беларускай дыяспары ў ЗША і Германіі можна прасачыць на працягу ўсяго пасляваеннага перыяду. Так, для падтрымкі навуковай працы ў 1951 г. у Нью-Йорку былі заснаваны Беларускі інстытут навукі і мастацтва (БІНІМ), яго старшынёю з 1982 г. быў В.Кіпель, які пачынаў сваю дзейнасць у Германіі, а з 1955 г. у Нью-Йорку заняўся складваннем беларускай замежнай бібліяграфіі.

А ў Германіі важным цэнтрам гуртавання нацыянальных навукова-культурных сіл ў 1950-х гадах стаў Мюнхен (Баварыя), дзе працавалі беларускае выдавецтва "Бацькаўшчына" і самастойны аддзел БІНІМа (1955-1966 гг.).